# Секция 4

***В. М. Бігеза,***
*дацэнт кафедры менеджменту*
*інфармацыйна-дакументнай сферы,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

## АСАБЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАКТЫКА-АРЫЕНТАВАНАГА НАВУЧАННЯ БУДУЧЫХ БІБЛІЯТЭКАРАЎ

Павышэнне ролі адукацыі і культуры ў XXI ст. абумоўліваюць высокія патрабаванні да прафесіяналізму спецыялістаў сферы культуры, у тым ліку бібліятэчных спецыялістаў. Сёння ў аснову падрыхтоўкі будучага спецыяліста УВА пакладзены кампетэнтнасны падыход, які прадугледжвае вызначэнне ведаў, уменняў, вопыту выпускніка, якія неабходны для вырашэння тэарэтычных і практычных задач. На думку спецыялістаў, менавіта кампетэнтнасны падыход з'яўляецца сёння самым сучасным метадалагічным інструментам для «балонскага абнаўлення ў еўрапейскіх ВНУ вучэбных планаў і праграм» [3].

У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў падрыхтоўка бібліятэчных спецыялістаў рэгулюецца адукацыйным стандартам аб атрыманні вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці «бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках)», дзе сфармуляваны групы неабходных кампетэнцый і патрабаванні да іх: акадэмічныя, сацыяльна-асобасныя, прафесійныя [1]. Мяркуем, што вышэйназваныя кампетэнцыі з'яўляюцца ўніверсальнымі для спецыялістаў па адзначанай спецыяльнасці.

Названыя кампетэнцыі, якія фарміруюцца пры кампетэнтнасным падыходзе ў падрыхтоўцы бібліятэчных кадраў, безумоўна, прадвызначаюць сфарміраванасць у асобы ўнутранай матывацыі, псіхалагічнай і практычнай гатоўнасці для дасягнення як мага больш якасных вынікаў у сваёй прафесійнай дзейнасці і сацыяльным жыцці.

Неабходна падкрэсліць, што вырашэнне прафесійных задач выпускніка на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый (ФІДК) Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і мастацтваў дасягаецца праз вывучэнне цыклаў сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, агульнанавуковых і агульнапрафесійных дысцыплін, спецыяльных дысцыплін, якія вызначаны ў вучэбным плане па падрыхтоўцы бібліятэчных спецыялістаў да бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

Першы цыкл дысцыплін садзейнічае назапашванню ведаў для арыентацыі ў жыцці свету. Другі цыкл садзейнічае інтэлектуальнай дапытлівасці, навучанню жыццю праз агульнае развіццё. Трэці цыкл – цыкл спецыяльных дысцыплін – садзейнічае базавай падрыхтоўцы ў прафесійнай сферы.

На сучасным этапе перад вышэйшай адукацыяй ставіцца задача аднаўлення прафесійнай адукацыі на кампетэнтнаснай аснове шляхам узмацнення практычнай накіраванасці прафесійнай адукацыі пры захаванні яе фундаментальнасці [2].

Адзначым, што практыка-арыентаванае навучанне ў сістэме вышэйшай адукацыі разглядаецца навукоўцамі шматгранна [4].

Неабходна таксама канстатаваць, што ў адрозненне ад традыцыйнай адукацыі, арыентаванай на засваенне ведаў, практыка-арыентаваная адукацыя накіравана на набыццё ўменняў – вопыту практычнай дзейнасці. Узровень вопыту вызначаецца метадамі кампетэнтнаснага падыходу, які арыентаваны перш за ўсё на дасягненне пэўных вынікаў, набыццё значных кампетэнцый. Авалоданне ж кампетэнцыямі немагчыма без набыцця вопыту дзейнасці, г. зн. кампетэнцыі і дзейнасць непарыўна звязаны паміж сабой. У гэтых умовах працэс навучання ператвараецца ў працэс вучэння, г. зн. у працэс набыцця ведаў, уменняў і вопыту дзейнасці з мэтай дасягнення прафесійна і сацыяльна значных кампетэнцый.

Практыка-арыентаваны характар выкладання спецыяльных дысцыплін знаходзіць адлюстраванне ў формах і метадах навучання. Акрамя лекцый, семінарскіх, лабараторных і практычных заняткаў, усё больш выкарыстоўваюцца такія формы, як ролевыя і дзелавыя гульні, трэнінгі, вырашэнне вытворчых задач, навучанне ў парах, падрыхтоўка мерапрыемстваў для канкрэтных мэтавых груп карыстальнікаў, індывідуальныя заданні, арыентаваныя на стымуляванне як інтэлектуальнага, так і асобаснага станаўлення студэнтаў. Уключэнне ў вучэбную дзейнасць элементаў праблематызацыі, навуковага пошуку, разнастайных форм самастойнай работы, а таксама вывучэнне вопыту бібліятэк замежных краін шляхам параўнальнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аналізу будзе садзейнічаць дасягненню студэнтамі дакладных вынікаў навучання, якія, на думку В. Л. Жук, з'яўляюцца асновай развіцця кампетэнцый.

Па нашым меркаванні, адным з кампанентаў практыка-арыентаванага навучання ў кантэксце кампетэнтнаснага падыходу з'яўляецца інавацыйнае навучанне, якое разглядаецца навукоўцамі як у тэарэтычным, так і практычным аспектах. Інавацыйнае навучанне прадугледжвае новы якасны ўзровень адукацыі спецыялістаў, гатовых да пераўтваральнай дзейнасці, пастаяннага развіцця і самаразвіцця. Менавіта кампетэнтнасны падыход закладзены сёння ў змест новага адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці «бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць», у адпаведнасці з якім па кожным курсе пераглядаюцца мэтавая накіраванасць, формы вучэбных заняткаў, змест заданняў для самастойнай работы, рыхтуецца праграмная і вучэбна-метадычная дакументацыя.

Адзначым таксама, што практыка-арыентаванай падрыхтоўцы будучых бібліятэчных спецыялістаў садзейнічае праблемнае навучанне, якое дазваляе навучэнцам на аснове выкарыстання разнастайнай інфармацыі выпрацаваць асабістыя рашэнні адносна існуючай праблемнай сітуацыі.

У рэчышчы разглядаемай праблемы практыка-арыентаванаму навучанню студэнтаў садзейнічае і выкарыстанне метаду праектаў, які вырашае задачы развіцця пазнавальных навыкаў навучэнцаў, іх крытычнага мыслення, уменняў арыентавацца ў інфармацыйнай прасторы.

Апынуцца ў рэальнай жыццёвай сітуацыі дазваляе студэнтам і выкарыстанне выкладчыкамі метаду кейса (case study), які прадугледжвае вырашэнне практычных праблем на падставе пэўнага комплексу ведаў. Названыя інтэрактыўныя метады навучання ўздзейнічаюць на прафесіяналізацыю навучэнцаў, фарміруюць пазітыўную матывацыю ў адносінах да вучобы.

Немалаважнае значэнне ў практыка-арыентаваным навучанні студэнтаў мае міждысцыплінарная інтэграцыя, пытанні якой абмяркоўваюцца на пасяджэннях метадычных камісій кафедр факультэта. Прынятыя рашэнні ўводзяцца ў навучальны працэс.

Падкрэслім, што ў значнай ступені практыка-арыентаванаму навучанню студэнтаў садзейнічаюць створаныя на кафедрах ФІДК сучасныя вучэбна-навукова-вытворчыя комплексы (ВНВК), якія грунтуюцца на ўзаемасувязі адукацыі і практыч-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най дзейнасці базавых бібліятэк. Дзякуючы гэтаму адбываецца насычэнне вучэбнага працэсу практычнымі праблемамі, а таксама замацаванне атрыманых ведаў і ўменняў. Згаданыя комплексы садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да навукова-даследчай, практыка-арыентаванай дзейнасці. Гэта дзейнасць праяўляецца пры напісанні курсавых работ, дыпломных праектаў, магістарскіх дысертацый, працуючы над якімі навучэнцы набываюць навыкі прымянення атрыманых ведаў для вырашэння практычных задач, што садзейнічае развіццю творчага мышлення, здольнасцей. Абавязковым кампанентам навуковых работ з'яўляецца практычная частка, прысвечаная разнастайным кірункам дзейнасці бібліятэк на сучасным этапе, а таксама асабістыя прапановы студэнтаў па ўдасканаленні гэтай дзейнасці.

Пацвярджэннем эфектыўнасці навуковых даследаванняў студэнтаў пад кіраўніцтвам выкладчыкаў кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы з'яўляецца штогадовае прысуджэнне студэнцкім навуковым работам I і II катэгорый на рэспубліканскім конкурсе.

Акрамя таго, на факультэце існуе практыка далучэння вядучых бібліятэчных спецыялістаў да рэцэнзавання вучэбных праграм, дыпломных праектаў, магістарскіх дысертацый. Выкладчыкі кафедр узгадняюць тэматыку курсавых і дыпломных работ з супрацоўнікамі бібліятэк з пункту гледжання практыка-арыентаванасці і інавацыйнасці.

Адной з форм узаемадзеяння кафедр факультэта з базавымі арганізацыямі ў рамках ВНВК з'яўляецца запрашэнне вопытных спецыялістаў-практыкаў да выкладчыцкай дзейнасці на ўмовах сумяшчальніцтва. Выкарыстанне імі прыкладаў з прафесійнай дзейнасці забяспечвае эфектыўнасць практыка-арыентаванага навучання.

Узаемадзеянне выкладчыкаў і бібліятэчных спецыялістаў здзяйсняецца і пры арганізацыі і правядзенні розных відаў практыкі студэнтаў. Менавіта базавыя бібліятэкі з'яўляюцца пляцоўкамі для праходжання студэнтамі вучэбнай, вытворчай і пераддыпломнай практыкі, правядзення практычных, семінарскіх заняткаў. Вытворчая практыка дазваляе студэнтам акунуцца ў спецыфічную бібліятэчную атмасферу, усвядоміць свае прафесійныя якасці, змест сваёй прафесійнай дзейнасці. Паўнацэнная самастойная праца ў якасці бібліятэкара садзей-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нічае набыццю асабістага вопыту, у студэнтаў выпрацоўваюцца прафесійныя, камунікатыўныя навыкі. Вельмі часта па выніках праходжання практыкі кіраўніцтвам гэтых арганізацый вырашаюцца пытанні працаўладкавання будучых спецыялістаў.

Цікавай і карыснай формай супрацоўніцтва выкладчыкаў кафедр і бібліятэчных спецыялістаў з'яўляецца правядзенне сумесных навукова-практычных канферэнцый, семінараў, круглых сталоў, майстар-класаў, на якія таксама запрашаюць студэнтаў, магістрантаў. Гэта садзейнічае пашырэнню іх прафесійнага кругагляду, развіццю творчага мышлення.

Практыка-арыентаванае навучанне садзейнічае авалоданню зместам прафесійнай падрыхтоўкі, з'яўляецца найважнейшым сродкам развіцця і самаразвіцця асобы. Менавіта такое навучанне з'яўляецца асновай інавацыйнай сістэмы падрыхтоўкі выпускнікоў, якія валодаюць неабходным аб'ёмам ведаў і навыкамі самастойнага вырашэння разнастайных прафесійных задач, што і пакладзена ў аснову падрыхтоўкі спецыяліста з пункту гледжання кампетэнтнаснага падыходу.


*1.* Высшее образование. Первая ступень : специальность 1-23 01 11 Библиотечно-информационная деятельность (по направлениям) : ОСВО 1-23 01 11-2014. – Минск : М-во образования Респ. Беларусь, 2014. – 41 с.

*2. Жук, О. Л.* Направления модернизации высшего образования и требования к педагогическим компетенциям преподавателей в контексте Болонского процесса / О. Л. Жук // Вышэйшая школа. – 2015. – № 5. – С. 18–22.

*3. Макаров, А. А.* Болонский процесс: европейское пространство высшего образования / А. В. Макаров. – Минск : РИВШ, 2015. – 260 с.

*4. Ялалов, Ф. Г.* Деятельностно-компетентностный подход к практико-ориентированному образованию / Ф. Г. Ялалов [Электронный ресурс] // Интернет-журналы «Эйдос». – 2007. – Режим доступа : http:// www.eidos.ru/journal/2007/ 0115-2.htm. – Дата доступа : 15.01.2015.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ